ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
10
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 22 (1360)

Выходзіць раз у тыдзень

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПРЭЗІДЭНТЫ ЗЯМЛЯЦТВАЎ

замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, на чарговай нарадзе абмеркавалі ход сесіі і пытанні летняга адпачынку. Гэтым летам студэнты з розных краін свету будуць мець магчымасць правесці канікулы ў дамах адпачынку ў Адлеры і на беларускім возеры Нарач, а таксама ў пансіянаце «Марскі прыбой» пад Ленінградам. На аўтапаяздах дружбы яны могуць азнаёміцца з мясцінамі баявой і працоўнай славы Беларусі, Украіны, Узбекістана. Вялікая група замежных студэнтаў наведае з экскурсіямі Маскву, Ленінград, Кіеў, Ерэван, Баку, Адэсу.

**М. СЫЧОЎ,**
**старшы інспектар дэканата па навучанню замежных студэнтаў.**

### НА АПОШНІМ ПАСЯДЖЭННІ

прэзідыума прафкома зацверджаны кандыдатуры байцоў атрада «Беларусь», які выязджае ў час летніх канікулаў у лагер працы і адпачынку, размешчаны ў Гурзуфе. У саставе атрада — камсамольскія і прафсаюзныя актывісты ўсіх факультэтаў універсітэта.

**Н. ТУРОМША,**
**намеснік старшыні прафкома.**

### ЗАКОНЧЫЛІСЯ ЗАНЯТКІ

кінауніверсітэта для студэнцкай моладзі «Кіно і час», які працаваў у БДУ з кастрычніка мінулага года. У праграму яго заняткаў уваходзілі сустрэчы з папулярнымі кінаакцёрамі, выступленні творчых работнікаў вядучых кінастудый краіны, рэжысёраў і аператараў вядомых фільмаў, гутаркі аб актуальных праблемах развіцця сучаснага кінамастацтва. Лекцыі суправаджаліся тэматычным паказам фільмаў. Сярод студэнтаў універсітэта было распаўсюджана каля тысячы абанементаў кіналекторыя.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**

### НА ТВОРЧУЮ СУСТРЭЧУ

з сённяшнім саставам студэнцкага народнага тэатра БДУ прыйшлі выпускнікі універсітэта пасляваенных гадоў, былыя члены аднаго са старэйшых студэнцкіх самадзейных калектываў. Сярод гасцей была выхаванка універсітэта заслужаная артыстка БССР Р. Ф. Маслачэнка, якая зараз працуе ў Тэатры юнага гледача.

**С. ДАРАШЭНКА.**

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ



**Знаёмцеся — студэнтка-трэцякурсніца геафака Ірына Лапыр. Намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта, адказная за работу акадэмічнага сектара. Выдатніца. З поспехам здала залікі, рыхтуецца да экзаменаў. Вядома, намерваецца здаць толькі на выдатна. Любіць спорт, асабліва лыжы, веславанне. І як сапраўдны географ, марыць пабываць на Паміры.**

**За актыўную жыццёвую пазіцыю, выдатную вучобу і ўдзел у грамадска-палітычным жыцці універсітэта камсамолка Ірына Раландаўна Лапыр вылучана кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў горада Мінска.**

Фота **В. Шачака.**

## ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

ПАДРЫХТОЎКА і правядзенне выбарчай кампаніі патрабуе асаблівай адказнасці і высокай арганізаванасці. Творча і падзелавому падышлі да адпаведнай арганізацыйнай і агітацыйна - прапагандысцкай работы ва універсітэце. Ужо ў красавіку ў асноўным быў сфарміраваны агіткалектыў, у які ўвайшлі прадстаўнікі геаграфічнага факультэта, факультэта журналістыкі, вылічальнага цэнтра і сацыялагічнай лабараторыі — усяго 35 чалавек. Загадчыкам агітпункта па выбарчаму ўчастку № 29 зацверджаны дацэнт юрыдычнага факультэта В. Г. Ціхіня. Сярод супрацоўнікаў агітпункта — члены КПСС, вопытныя агітатары, якія прымалі ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў і раней, моладзь.

І вопытныя і пачынаючыя агітатары перад пачаткам работы сталі ўдзельнікамі гутаркі аб асаблівасцях сёлетняй выбарчай кампаніі, аб задачах, якія стаяць перад агіткалектывам. Агітатары азнаёміліся з тэрыторыяй свайго выбарчага ўчастка, удзельнічалі ў афармленні нагляднай агітацыі, складалі спісы выбаршчыкаў, пастаянна дзяжураць на агітпункце.

Работа агітпункта і агіткалектыву адпавядае прынятаму плану. Праведзены сустрэчы дэпутатаў з выбаршчыкамі, рэгулярнымі сталі гутаркі аб міжнародным становішчы, арганізавана дэманстрацыя мастацкіх фільмаў, штотыднёва ўсе зацікаўленыя маюць магчымасць атрымаць кваліфікаваную кансультацыю вядучых юрыстаў універсітэта па прававых пытаннях.

«Дэмакратызм выбараў у краінах сацыялізму», «Антыдэмакратычная сутнасць буржуазнай дзяржавы» — вось некаторыя тэмы дакладаў, з якімі выступілі перад выбаршчыкамі выкладчыкі Белдзяржуніверсітэта.

У маі членамі агіткалектыву было арганізавана ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а потым для жыхароў мікрараёна быў дадзены канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Трэба адзначыць, што да работы з насельніцтвам нашага выбарчага ўчастка мы падыходзім дыферэнцыравана. Значная ўвага ўдзяляецца тым, хто прыйдзе галасаваць упершыню. На агітпункце аформлены куток маладога выбаршчыка. Моладзі адрасаваліся лекцыі «Савецкая выбарчая сістэма», «Мы і ідэалагічная барацьба». Асобныя мерапрыемствы разлічаны на выбаршчыкаў больш сталага ўзросту, пенсіянераў, ветэранаў вайны і працы. Дэвіз работы нашага агіткалектыву — дайсці да кожнага.

**С. ПЛУЖНІКАЎ,**
**загадчык агіткалектыву, выкладчык кафедры гісторыі КПСС.**

## Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТАВ. БЕЛАГА У.А. ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларускай ССР тав. **Белага** Уладзіміра Аляксеевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**І. ПАЛЯКОЎ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Л. ЧАГІНА.**

7 чэрвеня 1982 года. г. Мінск.

● СЛОВА ПРА КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ

## КУРС ЖЫЦЦЯ

ЧАРГОВАЕ пасяджэнне камітэта народнага кантролю універсітэта. Аб выніках запланаванай праверкі паведамлялі члены аднаго з сектара. Ім задавалі пытанні, адказы абмяркоўвалі...

— Якія будуць прапановы па выніках праверкі? — звяртаецца да членаў камітэта яго старшыня, дацэнт кафедры цеплафізікі Ала Станіславаўна Каспяровіч.

Заўсёды прынцыповая атмасфера пануе на пасяджэннях універсітэцкага КНК. І не будзем забываць, што стварэнне яе, як і зладжанага рытму работы камітэта народнага кантролю, безумоўна, — заслуга старшыні. І яшчэ народны кантроль — арганізацыя, якая часта мае справы з негатыўнымі з'явамі жыцця, якая пастаянна стаіць на варце законнасці, выкрываючы парушэнні і злоўжыванні. Як важна кожнаму члену яе быць прынцыповым. Як важна ў кожным асобным выпадку разабрацца поўнасцю, не памыліцца, не пакрывіць душой, адшукаць адзіную ісціну. Ад кожнага члена КНК і асабліва ад старшыні патрабуецца максімум душэўнай увагі, сумленнасці, чалавечнасці. Патрабуецца перш за ўсё — партыйны падыход да сваіх абавязкаў. Тут, на пасяджэннях універсітэцкага КНК, можна ўпэўніцца, што ўсе пералічаныя якасці ўласцівы Але Станіславаўне Каспяровіч. Іменна аб гэтым гаварыў на універсітэцкім сходзе па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў былы аднакурснік Алы Станіславаўны, а цяпер супрацоўнік кафедры агульнай фізікі Генадзь Станіслававіч Кямброўскі.

А. С. Каспяровіч на выдатна закончыла аддзяленне фізікі фізмата БДУ і ў ліку лепшых студэнтаў была накіравана ў Маскву, дзе працавала ў інстытуце аўтаматыкі і тэлемеханікі АН СССР. Паралельна яна закончыла вячэрняе аддзяленне Маскоўскага энергетычнага інстытута. А потым — праца ў Навукова-даследчым інстытуце цепла- і масаабмену АН БССР. З 1967 года, з часу стварэння ў Белдзяржуніверсітэце кафедры цеплафізікі, Ала Станіславаўна пераходзіць ва універсітэт на выкладчыцкую работу.

Успамінае Г. С. Кямброўскі і аб грамадскай рабоце Алы Станіславаўны. Яшчэ ў студэнцкія гады яна — нязменны праферг. У час работы ў БДУ — нязменны куратар. Неаднаразова выбіралася членам партыйнага бюро факультэта. Цяпер — член бюро парткома. Шмат гадоў старшыня спачатку групы, а з 1980 года — камітэта народнага кантролю БДУ.

Вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў было для Алы Станіславаўны па асабістаму прызнанню — нечаканым. Але ўсё яе жыццё сведчыць аб тым, што прызнанне калег і ўсяго універсітэцкага калектыву — заканамернасць.

З цеплынёй адзываюцца аб Але Станіславаўне выхаванцы. Чацвёртакурсніца фізфака Людміла Мазанік расказвае аб яе ўважлівасці і патрабавальнасці да студэнтаў, аб змястоўных і цікавых занятках.

Работа, падрыхтоўка да заняткаў, грамадскія даручэнні — вось асноўная схема, па якой распланаваны кожны працоўны дзень Алы Станіславаўны. А яшчэ яна — жонка і маці, што таксама накладвае на яе, як і на кожную жанчыну, вялікія абавязкі. А яшчэ... кожны вечар з нецярплівасцю чакае бабулю з работы ўнук Максімка.

— Мы з ім добра сябруем,— з нейкай дамашняй усмешкай прызнаецца Ала Станіславаўна. — Але вось толькі часу на сустрэчы вельмі і вельмі не хапае...

**Т. САХАШЧЫК.**

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

# СУГУЧНАСЦЬ ДУМКІ І СПРАВЫ

Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Аляксеевіча Белага — вядомага савецкага вучонага ў галіне фізікі і механікі палімераў, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР, рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР, акадэміка АН БССР. Далёка не ўсё, што ім зроблена, можа быць адлюстравана ў гэтых штрыхах да яго партрэта. Ён быў дэлегатам XXIV і XXVI з'ездаў КПСС, многіх з'ездаў Кампартыі Беларусі. Член Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Па кожнай пасобку з гэтых адказных сфер прыкладання сіл Уладзіміра Аляксеевіча можна пісаць цэлыя нарысы. А ў рэальным жыцці яны так цесна і ўзаемна звязаны і складаюцца з такога мноства адценняў, што няма магчымасці раскрыць у поўнай меры іх глыбіню ў абмежаваным па памеры артыкуле. Застаецца вызначыць найбольш важнае і істотнае...

Навукова-педагагічная дзейнасць Уладзіміра Аляксеевіча пачалася ў Растоўскім-на-Доне інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту, які ён закончыў на выдатна. У 1953 годзе Уладзімір Аляксеевіч пасля паспяховага заканчэння аспірантуры ў Маскве накіроўваецца ў Гомель з адказным заданнем па арганізацыі Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. З гэтага часу ўся яго дзейнасць звязана з развіццём навукі і адукацыі ў Беларусі. У 1960 годзе з групай сваіх вучняў ён закладвае асновы першага буйнога перыферыйнага інстытута АН БССР — Інстытута механікі металапалімерных сістэм (ІММС), які атрымаў шырокае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

У 1969 годзе Уладзімір Аляксеевіч Белы назначаецца першым рэктарам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, застаючыся дырэктарам ІММС. У 1973 годзе ён выбіраецца віцэ-прэзідэнтам АН БССР, застаючыся дырэктарам Інстытута механікі металапалімерных сістэм. У кастрычніку 1978 года Уладзімір Аляксеевіч назначаецца рэктарам Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, застаючыся віцэ-прэзідэнтам АН БССР. І куды б ні накіроўвала партыя Уладзіміра Аляксеевіча Белага, на кожнай пасадзе ён аддае ўсе свае сілы, энергію, веды даручанай справе. Сваёй нястомнай дзейнасцю ён уносіць істотны ўклад у развіццё вышэйшай адукацыі і навукі ў рэспубліцы і краіне.

Працуючы рэктарам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, Уладзімір Аляксеевіч рашаў шматлікія задачы, звязаныя з ператварэннем пед-інстытута ва універсітэт. Пад яго кіраўніцтвам за чатыры гады была створана новая матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта, значна палепшыліся жыллёва-бытавыя ўмовы студэнтаў і выкладчыкаў. Рэзка ўзрасла ва універсітэце колькасць дактароў і кандыдатаў навук.

На пасадзе віцэ-прэзідэнта АН БССР ён курыруе аддзяленнем фізіка-тэхнічных навук, а таксама дзейнасцю інстытутаў АН БССР па такіх складаных і адказных пытаннях, як укараненне навуковых распрацовак у вытворчасць, патэнтна-ліцэнзійная работа, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і інш.

І канешне ж, аддаючы належнае ролі партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, патрэбна сказаць, што поспехі і дасягненні апошніх гадоў флагмана вышэйшай школы рэспублікі — БДУ імя У. І. Леніна — непарыўна звязаны з энергічным кіраўніцтвам Уладзіміра Аляксеевіча. Павысілася якасць падрыхтоўкі выпускнікоў. Аб гэтым сведчаць не толькі рэзультаты сесій, але і водгукі з месц работы выхаванцаў універсітэта. На ўздыме знаходзіцца навука: павысілася якасць публікацый і ўзрасла іх колькасць. Эканамічны эфект ад укаранення навуковых распрацовак у вытворчасць узрос за апошні час у некалькі разоў і дасягнуў у 1981 годзе 23 млн. рублёў. Упершыню ў гісторыі універсітэта толькі за адзін год — 1981 — было абаронена звыш 100 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Заканамерным вынікам паляпшэння ўсёй дзейнасці калектыву універсітэта з'яўляецца ўзнагароджанне пераходным Чырвоным Сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК галіновага прафсаюза па рэзультатах Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за 1979, 1980 і 1981 гады.

Ужо гэтых прыкладаў, якія адносяцца да дзейнасці Уладзіміра Аляксеевіча як арганізатара і кіраўніка, — якая, дарэчы, грунтуецца на яго глыбокім веданні вышэйшай школы (перш чым быў назначаны рэктарам, ён прайшоў шлях лабаранта, асістэнта, старшага выкладчыка, дацэнта, намесніка дэкана, дэкана, начальніка вучэбнай часткі, загадчыка кафедры, прафесара, прарэктара), акадэмічных цэнтраў і здзіўляючай працаздольнасці хапіла б на некалькі жыццяў. Але, сказаўшы толькі гэта, мы непамерна звузілі б пастаянны, штодзённы фронт намаганняў гэтага чалавека і кола яго інтарэсаў.

Рабочы дзень акадэміка АН БССР У. А. Белага пачынаецца ў 5 гадзін раніцы — такі цвёрда ўстаноўлены рэжым рабочага часу. Іменна ў гэтыя ранішнія часы Уладзімір Аляксеевіч займаецца навуковай працай. А днём, у звычайны працоўны час, ён рэктар універсітэта і віцэ-прэзідэнт АН БССР, і тут рэжым дня распісаны па мінутах. Іменна гэта строгасць, унутраная глыбокая арганізаванасць і самадысцыпліна — характэрныя штрыхі да яго партрэта.

У. А. Белы з'яўляецца заснавальнікам новага арыгінальнага навуковага напрамку — механікі металапалімераў. Ён сфармуляваў важную навуковую і навукова-гаспадарчую праблему аптымальнага спалучэння палімераў з іншымі матэрыяламі, у прыватнасці з металамі. У навуковым плане складанасць гэтай праблемы звязана з неабходнасцю вывучэння фундаментальных уласцівасцей палімераў і іншых матэрыялаў, а таксама асаблівасцей іх кантактнага ўзаемадзеяння. У практычным аспекце рашэнне гэтай праблемы дае істотную эканомію матэрыяльных і сыравінных рэсурсаў.

Бурнае развіццё механікі металапалімераў, як сведчаць вядомыя савецкія і замежныя вучоныя, стала магчымым дзякуючы навуковай дзейнасці У. А. Белага і створанай ім новай навуковай школы, працы якой ахопліваюць практычна ўсе аспекты прапанаванага У. А. Белым напрамку: ад пошуку на атамна-малекулярным і надмалекулярным узроўні ўзаемадзеяння асобных элементаў металапалімераў да стварэння навуковых прынцыпаў канструявання новых кампазіцыйных матэрыялаў і распрацоўкі арыгінальных разліковых і эксперыментальных метадаў даследавання напружана-дэфармiраванага стану і паводзін металапалімерных дэталей машын у самых розных, у тым ліку экстрэмальных умовах іх эксплуатацыі. Такі шырокі дыяпазон навуковых інтарэсаў доктара тэхнічных навук, прафесара фізікі і механікі палімераў, акадэміка АН БССР У. А. Белага садзейнічаў развіццю і шэрагу сумежных галін ведаў.

Для школы У. А. Белага характэрны арыгінальныя метады даследавання. Гэта натуральна, бо сам Уладзімір Аляксеевіч як вучоны вызначаецца ўменнем «схапіць» не толькі сутнасць вывучаемай праблемы, але і выбраць найбольш рацыянальныя шляхі і методыкі даследаванняў.

Аўтарытэт У. А. Белага як вучонага атрымаў міжнароднае прызнанне. Дастаткова сказаць, што даклады Уладзіміра Аляксеевіча на шматлікіх кангрэсах у Англіі, ГДР, Францыі, Японіі, ЗША, Італіі, ФРГ заўсёды атрымлівалі высокую ацэнку. У Францыі ён ўдастоены ганаровых медалёў імя Вакансона і Жакара. У. А. Белым апублікавана дзевяць манаграфій, каля чатырохсот навуковых прац, з якіх каля васьмідзесяці выдадзена за мяжой. Буйное англа-амерыканскае выдавецтва «Пергамон прэс» пераклала на англійскую мову і апублікавала яго манаграфію «Трение и износ материалов на основе полимеров».

Важнейшай асаблівасцю навуковай школы У. А. Белага з'яўляецца непарыўная сувязь фундаментальных і прыкладных даследаванняў, цесная сувязь навукі з вытворчасцю.



Сёння цяжка пераацаніць значэнне вырашаных У. А. Белым і яго вучнямі тэарэтычных праблем і створаных імі кампазіцыйных матэрыялаў для многіх галін народнай гаспадаркі. За распрацоўку тэарэтычных асноў стварэння фрыкцыйных матэрыялаў і канструкцый У. А. Беламу і яго вучням у 1972 годзе была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.

Галоўнай справай усяго жыцця У. А. Белага з'яўляецца падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі шырокага спектра, перш за ўсё — навуковых кадраў. Пад кіраўніцтвам У. А. Белага падрыхтавана каля 50 дактароў і кандыдатаў навук. Зараз многія вучні У. А. Белага самі паспяхова рыхтуюць кандыдатаў навук.

Значная роля У. А. Белага ў арганізацыі часопіса АН СССР і АН БССР «Трение и износ», галоўным рэдактарам якога ён з'яўляецца. Часопіс аб'яднаў намаганні савецкіх вучоных у гэтай галіне і заваяваў вялікі аўтарытэт у нашай краіне, а таксама за мяжой, аб чым сведчыць шырокае кола падпісчыкаў і набыццё права на перавыданне яго ў ЗША на англійскай мове з мэтай пашырэння карыстання ім ва ўсім свеце.

І канешне ж, нельга не адзначыць вынаходніцкую дзейнасць Уладзіміра Аляксеевіча. Заслужаны вынаходнік БССР У. А. Белы сумесна са сваімі вучнямі стаў ініцыятарам пачыну «Кожную навуковую распрацоўку — на ўзровень вынаходніцтва, кожны навуковы супрацоўнік— вынаходнік». Аб гэтым пачыне ВЦСПС дакладваў у рапарце XXIV з'езду КПСС. Вучні Уладзіміра Аляксеевіча дактары навук Б. І. Купчынаў, П. В. Сысоеў, А. І. Свірыдзёнак маюць па 100 і больш вынаходніцтваў. Больш за сто вучняў У. А. Белага сталі актыўнымі вынаходнікамі, двум з іх прысвоены ганаровыя званні заслужанага вынаходніка БССР.

На рахунку Уладзіміра Аляксеевіча больш за 200 вынаходніцтваў. Ім атрымана больш за 20 патэнтаў у Англіі, Францыі, ЗША, Японіі, ФРГ, Італіі, Швецыі і іншых замежных краінах. Для вырабу кампазіцыйных матэрыялаў, у аснове якіх ляжаць вынаходніцтвы У. А. Белага і яго вучняў, пабудаваны і будуюцца прамысловыя прадпрыемствы, якія даюць вялікі тэхніка-эканамічны эфект. За поспехі ў вынаходніцкай дзейнасці У. А. Белы ўзнагароджаны ганаровым медалём «Тэхніка —калясніца прагрэсу», чатырма залатымі медалямі і ганаровымі дыпломамі ВДНГ СССР.

У. А. Белы з'яўляецца актыўным барацьбітом за мір. З дакладамі аб міралюбівай палітыцы Савецкай дзяржавы ён выступае перад рознымі аўдыторыямі ў нашай краіне і за мяжой. За актыўную дзейнасць у барацьбе за мір і значныя ўзносы ў Фонд міру ён удастоены двух вышэйшых узнагарод Савецкага камітэта абароны міру.

Плённая праца У. А. Белага высока адзначана Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай. За вялікі ўклад у навуку, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў ён узнагароджаны вышэйшай узнагародай Радзімы — ордэнам Леніна, а таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

На рубяжы свайго 60-годдзя Уладзімір Аляксеевіч поўны новых творчых задум. Сённяшнія яго клопаты звязаны з далейшым павышэннем якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, эфектыўнасці навуковых даследаванняў, з умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. Жадаем яму вялікіх поспехаў у гэтай высакароднай справе. І ад усяго сэрца жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, асабістага шчасця, новых творчых дасягненняў у яго нястомнай дзейнасці дзеля нашай вялікай Айчыны, у імя перамогі ідэалаў камунізму.

**У. ІВАШЫН,**
**прарэктар універсітэта, прафесар.**
**М. ЕЛІСЕЕЎ,**
**сакратар парткома, дацэнт.**

# РАСШЫРАЦЬ НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

**В**ЯЛІКАЯ ЎВАГА ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў удзяляецца навукова-даследчай рабоце студэнтаў. Яна не толькі ўзбагачае іх ведамі і навыкамі даследавання, але і дапамагае вырашаць шэраг практычных праблем.

Навуковы студэнцкі гурток па эканамічнай геаграфіі СССР існуе з дня ўтварэння самой кафедры эканамічнай геаграфіі. У яго саставе каля 30 студэнтаў пераважна старэйшых курсаў. Работа гуртка ўключае падрыхтоўку студэнтамі навуковых дакладаў, рэферыраванне артыкулаў з часопісаў, выпускі спецыяльных нумароў газеты «Даследчык», сустрэчы з буйнымі вучонымі і спецыялістамі розных ведамстваў і арганізацый Мінска, прагляд цікавых вучэбна-пазнавальных фільмаў аб нашай краіне і шмат іншага.

Тэматыка навуковых дакладаў студэнтаў, як правіла, адпавядае тэматыцы навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры. Так, у 1981—1982 навучальным годзе прачытаны даклады аб праблемах развіцця асобных галін прамысловасці Брэсцкай і Мінскай абласцей (кіраўнікі дацэнты Л. А. Паўловіч, С. І. Сідар, Г. В. Анічэнка, В. В. Некрыш), аб тарфяных рэсурсах БССР і іх гаспадарчым выкарыстанні (кіраўнік прафесар І. І. Трухан), аб развіцці буракасахарнай прамысловасці БССР (кіраўнік прафесар А. Я. Малышаў), аб сыравінных зонах бульбаперапрацоўваючых прадпрыемстваў, а таксама аб структурных і тэрытарыяльных адрозненнях кармавой базы Брэсцкай вобласці (кіраўнік Н. І. Жураўская) і іншыя даклады.

Найбольшую актыўнасць у рабоце навуковага студэнцкага гуртка прымаюць студэнты В. Вяцкі, Е. Вайнер, Н. Камса, Г. Рабчэня, В. Русецкі, Н. Каранкевіч, Ю. Туроўскі (IV курс), а таксама І. Красоўская, Т. Дзенісюк, А. Галубцоў (III курс) і іншыя. 9 дакладаў членаў гуртка было прадстаўлена на XXXIX навуковую студэнцкую канферэнцыю БДУ імя У. І. Леніна, а двое студэнтаў — А. Галубцоў і Т. Дзенісюк — выязджалі ў Растоўскі універсітэт, дзе выступалі з дакладамі аб ахове прыродных рэсурсаў у Салігорскім прамысловым вузле і аптымізацыі прыродакарыстання ў раёнах асушаных зямель.

У наступным навучальным годзе навуковыя даследаванні студэнтаў, замацаваных за кафедрай, плануецца расшырыць у напрамку распрацоўкі пытанняў аптымізацыі развіцця аграпрамысловых комплексаў Мінскай вобласці, а таксама эканамічных аспектаў аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага гаспадарчага выкарыстання прыродных рэсурсаў у БССР — найбольш надзённых праблем сучаснасці, вызначаных апошнімі рашэннямі партыі і ўрада ў сувязі з распрацоўкай Харчовай праграмы нашай краіны.





**Н. ЖУРАЎСКАЯ,**
**кіраўнік навуковага студэнцкага гуртка па эканамічнай геаграфіі СССР.**

**НА ЗДЫМКАХ:** чарговае пасяджэнне навуковага гуртка; з дакладам выступае стараста гуртка В. Вяцкі.

Фота аўтара.

# Алімпіяда вызначыла лепшых

УСЕСАЮЗНАЯ алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», якая стала своеасаблівай сістэмай масавых спаборніцтваў будучых спецыялістаў у веданні дысцыплін, што вывучаюцца ў вышэйшай школе, праводзіцца кожны год з мэтай павышэння якасці вывучэння студэнтамі фундаментальных навук і спецыяльных прадметаў, развіцця ў іх навыкаў самастойнай работы, набыцця патрэбы ў творчым авалоданні ведамі. Яшчэ адна мэта правядзення алімпіяды — актывізацыя і ўдасканаленне дзейнасці кафедр у арганізацыі вучэбнай і пазавучэбнай работы са студэнтамі па прадмету і спецыяльнасці, а таксама ўмацаванне ролі камсамольскай арганізацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Прадметныя алімпіяды, якія праводзяцца пераважна сярод студэнтаў малодшых курсаў на базе пройдзенага імі матэрыялу, а таксама конкурсы па спецыяльнасцях, што разлічаны на старшакурснікаў і прадугледжваюць не толькі развіццё глыбіні тэарэтычных ведаў, але і выяўленне ўмення будучых спецыялістаў карыстацца сучаснымі прыладамі і абсталяваннем, складаюць першы тур алімпіяды.

Сёлета 3487 студэнтаў БДУ прынялі ўдзел у прадметных алімпіядах па 11 вучэбных дысцыплінах. Акрамя таго, ва універсітэце было праведзена 17 конкурсаў па спецыяльнасці, у якіх удзельнічала 5199 студэнтаў. У прадметных алімпіядах і асобных конкурсах прыняло ўдзел шмат замежных студэнтаў.

Да ўдзелу ў другім, рэспубліканскім туры алімпіяды дапускаюцца пераможцы прадметных алімпіяд і конкурсаў у асабістым заліку.

Па выніках другога тура алімпіяды па рускай мове і літаратуры першае месца заняла каманда БДУ. У асабістым заліку першыя тры месцы адпаведна прысуджаны С. Стадуб (студэнтцы IV курса філфака), трэцякурсніцы Л. Супрун і чацвёртакурсніку А. Малахаву.

Удзельнікам другога тура алімпіяды па спецыяльнасці «правазнаўства» былі прапанаваны задачы і пытанні па крымінальнаму і грамадзянскаму праву. Пераможцам стаў студэнт IV курса юрыдычнага факультэта БДУ П. Барташ. Другое і трэцяе месцы ў прадстаўнікоў Гродзенскага універсітэта.

Каманда нашага універсітэта была лепшай і ў алімпіядзе па матэматыцы. У тройку лепшых увайшлі чацвёртакурснік мехмата Ву Кім Туан, трэцякурснік Л. Петрусевіч і чацвёртакурснік В. Беняш-Крывец.

Студэнтам III і IV курсаў фізфака былі прапанаваны задачы, якія ахоплівалі ўсе раздзелы курса агульнай фізікі. Першае, другое і чацвёртае месцы занялі прадстаўнікі каманды БДУ — Ю. Макушок, С. Дабрынеўскі, А. Мяцеліца.

Студэнтам III і IV курса фізякія навучаюцца ў ВНУ рэспублікі, удзельнічалі ва ўсіх прадметных алімпіядах на агульных падставах. Выключэнне для іх — асобнае правядзенне алімпіяды па рускай мове і літаратуры. Замежныя студэнты універсітэта спаборнічалі з камандамі замежных студэнтаў БПІ, БІМСГ, БДІНГ, БСГА. Яны пісалі сачыненні на тэмы «Чужая мова — акно ў свет», «У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу». Усе, хто атрымаў адзнакі «добра» і «выдатна», удзельнічалі ў вусным субясядаванні. Лепшымі былі прызнаны студэнты БДУ Ноак Андрэас і Ле Т'ен Хай. У камандным заліку першынство таксама за Беларускім універсітэтам.

Правядзенне кожнай прадметнай алімпіяды ўключала ў сабе, акрамя конкурсаў, яшчэ і культурную праграму. Госці мелі магчымасць пазнаёміцца з кафедрамі факультэтаў, наведаць некаторыя інстытуты АН БССР, удзельнічалі ў святочных вечарах, наведалі славутыя мясціны сталіцы рэспублікі.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

ДА ЮБІЛЕЮ РАДЗІМЫ

# ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СССР

ВЫСОКАЯ БЯЛЯВАЯ дзяўчына з блакітнымі вачыма чытала Фета. Чытала здзіўляюча лёгка і неяк асабліва пранікнёна. Здавалася, што яна проста размаўляе з сябрамі, выказваючы нешта да дробязей прачулае...

Любоў да рускай паэзіі сабрала разам юнакоў і дзяўчат фізічнага факультэта. Сёння яны не проста празаічна-заклапочаныя студэнты, якія штодзённа сустракаюцца разам на занятках і ў лабараторыях. Узвышаныя, святочна ўсхваляваныя, яны прыйшлі пагаварыць аб самым таямнічым, успомніць аб дарагіх і блізкіх нашаму сэрцу паэтах.

— Паспрабуйце забраць паэзію з вякоў! Чым менш паэзіі, тым больш пустаты. Паэзія, як і ўсё жыццё чалавека, трымаецца на любві. Любві да маці, сястры, дачкі, жонкі, — усхвалявана гаворыць Лена Кішкевіч, супрацоўніца аддзела масавай работы бібліятэкі, вядучая гэтага вечара.

Не змаўкае размова аб самым цудоўным у свеце — аб любві і паэзіі. Гучаць чароўныя рамансы Ліста, Глінкі, Чайкоўскага. Мы быццам перагортваем неўміручыя старонкі паэтычнай анталогіі: Ф. Цютчаў, А. Качаткоў, Р. Гамзатаў, Э. Межэлайціс...

Змястоўна і цікава прайшоў гэты вечар паэзіі. У канцы яго многія са слухачоў самі чыталі свае любімыя вершы.

У год юбілею ўтварэння СССР супрацоўнікі аддзела масавай работы бібліятэкі падрыхтавалі цыкл паэтычных вечароў. Паспяхова прайшоў на геафаку адзін з іх, прысвечаны паэзіі С. Ясеніна. Асабліва запомнілася студэнтам фізічнага факультэта гадзіна грузінскай паэзіі. А ці можна забыцца пра сустрэчу з лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола, маладым беларускім паэтам Уладзімірам Някляевым, якая праходзіла нядаўна ў клубе «Красавік» факультэта прыкладной матэматыкі. Такія сустрэчы з паэзіяй не забываюцца.

Аддзел масавай работы універсітэцкай бібліятэкі працягвае метадычную распрацоўку вечароў, прысвечаных паэзіі братніх рэспублік СССР. Зараз ідзе падрыхтоўка матэрыялаў аб паэзіі народаў Прыбалтыкі.

**І. БАРДЗІЯН,**
**студэнтка журфака.**



**Больш за 300 пасланцоў усіх савецкіх рэспублік набываюць веды ў Маскоўскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці. Гэта не толькі адна з вядучых навучальных установ сярод галіновых ВНУ краіны, але і буйны навукова-даследчы цэнтр, дзе выкладчыкі і студэнты вырашаюць многія актуальныя праблемы. Тут рыхтуюць інжынерныя, канструктарскія і навуковыя кадры па дзесяці вядучых спецыяльнасцях галіны.**

**НА ЗДЫМКУ: навуковы гурток на кафедры тэхналогіі швейных вырабаў вядзе доктар тэхнічных навук Я. Х. Мелікаў (другі злева). А практычнай рабоце на стачваюча-абмётачнай машыне пад яго кіраўніцтвам навучаюцца студэнты (злева направа) Мая Бякіева з Туркменні, Гульджамал Мендзігулава з Кіргізіі, Рэната Калінаўскайтэ з Літвы, Мухат Мурзабаеў з Казахстана і Таццяна Зверава з Украіны.**

**Фота В. ЯЦЫНЫ.**

# Ружовы ранак

*Літаратурная старонка*

**СВЯТЛАНА ПАРЧЭЎСКАЯ**

## РАНЦА

Есць поле, што не ведае касы,
Там лета з траў зялёны ложак сцеле.
А вы збіралі кропелькі расы,
Якую промні выпіць не паспелі?..
Яна вясёлкай сонечнай гарыць,
І на сцяблінках ззяе дрыгатліва.
А на далонь яе не палажыць,
Бо, як вясёлка, гэта — толькі дзіва.
Вы вуснамі адчуйце чысціню,
І рэхам кроплі сэрца адзавецца...
Ступіце басанож у цішыню,
Каб тут, у полі, з раніцай сустрэцца.



**ВАЛЕРЫЙ МІГДАСЁЎ**

## БЕЗЫМЯННЫЕ ГЕРОИ

Вылитые в сотни обелисков,
Устремивши вдаль свой скорбный взгляд,
На покой и мир родной Отчизны
Воины безмолвные глядят.

Эти безымянные герои,
Не прожив сполна свои года,
Где-то у высотки за рекою
Распрощались с жизнью навсегда.

Сколько же погибло их, безусых,
Под огнем прицельным вражьих рот?!
Сколько не вернулось парней русских
С огненных, неведомых высот?!

Продолжают жизнь они в граните,
Став немым свидетелем войны.
И кричат их каменные лица:
«Миру больше жертвы не нужны!»

## ЗАЛІКОВАЯ КНІЖКА

Студэнты.
Іспыт.
Сесія.
Над інтэрнатам — ветах.
Яна — душы імпрэсія,
Яна — люстэрка ведаў.

Студэнты — народ імклівы,
Не ведаючы знямогі.
Пасля адзнак і залікаў
Кніжка — табло перамогі.
Яна на сесію кліча.

Хвалюемся мы і плачам...
Яна — партрэт і аблічча,
І талісман удачы.

**СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН**

## СЕСІЯ

Далікатнасць —
Адзнака на сесіі:
Каму весела,
А каму і не...
А да сесіі —
Не да пенсіі,
Пасля сесіі —
Жыць гучней.

Даверлівасць —
Адказ на сесіі,
Настоены на бяссонніцы.
Як дзве птушкі
Веснія,
Як дзве песні —
Сесія —
Маладосці конніца!



**ЮЛІЯ ГУРТОЎЦАВА**

***

Сумерки сгустились над землей,
Скрыли очертания предметов,
Тьма окутала вершины незаметно,
И деревья слились с темнотой.
Фонари как будто чуть согнулись,
Свет их меркнет, растворясь во мгле,
Словно руки ночи, по земле
Тени от деревьев протянулись.
Ночь сулит покой и благодать,
Но, не отдохнувший ни минутки,
Шар земной докручивает сутки,
Чтоб с разгона новые начать.

**УЛАДЗІМІР СІЎЧЫКАЎ**

## ПІЛА

Грызе піла калоны дрэў...
Спужаны птах, адчайны крык.
Руйнуюць лес — такі разлік,
Грызе піла калоны дрэў.
Дарогі рог — абшар узнік.
Палынны пыл — вятрыску спеў,
Грызе піла калоны дрэў...
Спужаны птах, адчайны крык.



## ВІЛІЯ

**ПЁТР АКСЮЧЫЦ**

ДАЎНО ГЭТА БЫЛО. Яшчэ майму дзеду Нічыпару, які памёр ва ўзросце 80 гадоў, расказваў гэтую гісторыю яго дзед.

...Сярод непраходных балот і густых зараснікаў алешыны і лазняку брала свой пачатак невялікая рачулка. Цяжкі шлях ляжаў у яе перад тым, як стаць спакойнай, шырокай ракой. Агінала яна травяністыя пагоркі, знікала ў непрыветлівых глухіх лясах, здзіўляла сваімі мудрагелістымі паваротамі, хуткасцю, якая пераходзіла ў спакойную, ганарлівую плынь. Гэта рэчка была багатая рыбай, бабры і выдры з вялікім задавальненнем засялялі яе лазняковыя берагі. Сяліліся ля ракі і людзі — рыба стала і для іх адным з асноўных пражыткаў. Шматлікія вёсачкі, якія «парадніліся» з ракой, і назвы атрымлівалі, звязаныя з ёю. Так, напэўна, адбылося і з невялікай вёскай Саковічы, мужыкі якой былі заўзятымі рыбаловамі. Яны самі пплялі з лазы рыбацкую снасць — сакі — і з поспехам лавілі імі рыбу.

Толькі сама рака, даўшы імёны сялібам, заставалася безыменнай.

Вясёлай і прыгожай была яна, але невясёлае жыццё было ў сялян, якія жылі ў вёсцы. Даводзілася ім і днём, і ўначы гнуць спіну на памешчыка, што жыў у вялікім, падобным на замак асабняку. Палову свайго ўраджаю і ўлову рыбы неабходна было аддаваць яму. Сам ён быў і суддзя, і палач, люта здзекаваўся над сялянамі.

Цяжка было і Янку, пастуху памешчыцкага стада. Прыгожы семнаццацігадовы хлапец меў сэрца добрае, вясёлае, справядлівае. Ніводную казяўку не пакрыўдзіць, ніводнага звярка не напужае.

Аднойчы, прыгнаўшы стада кароў на вадапой, лёг ён на цёплую зямлю і прыслухаўся да гудзення пчол. Гэтак ён аддаўся марам, што не прыкмеціў, як нехта яго разглядае. І толькі вясёлы і звонкі смех «вярнуў» яго на зямлю: перад Янкам стаяла прыгожая дзяўчына. Вочы ў яе былі блакітныя, нібы тое ж неба, маленькі кірпаты носік і доўгія цудоўныя валасы.

— Хто ты? — разгублена спытаў прыгажуню Янка.

— Я —Віля, а мой бацька жыве вунь там,—паказала яна ў бок сядзібы памешчыка. — Я прыехала на канікулы — навучаюся ў Вільні. А ты хто?

Хлопец не ведаў, што адказаць. Ён баяўся глядзець на дзяўчыну, такая яна была прыгожая і незвычайная.

— Я... Я... вось, — кіўнуў ён на мірна разлегшыхся кароў,— Гэта вашы...

— А тут цудоўна! Так?! — быццам не чуючы яго слоў, сказала яна, паказваючы вакол сябе.— А што за тым лесам?..

Шмат пытанняў задавала гэта бесклапотная, вясёлая Віля хлопцу. І, асмялеўшы, Янка з ахвотай адказваў на іх.

Яны сталі сустракацца часцей і пакахалі адзін аднаго. Аднойчы нехта бачыў, як яны раніцой, узяўшыся за рукі, беглі насустрач сонцу, то прыкмецілі, як яны сядзелі ля сваёй ракі...

Даведаўся хутка пра гэта грозны памешчык, загадаў слугам схапіць Янку. Зацягнулі хлопца ў склеп, доўга і злосна білі. Нічым не магла дапамагчы свайму каханаму Віля, чуючы яго стогны. Замкнуў яе бацька ў хаце.

Не вытрымаў юнак бязлітасных udaраў палак — памёр на трэці дзень. Пахавалі яго ў лесе, зраўняўшы магілку з зямлёй.

Не любым стала жыццё для Вілі. Аднойчы збегла яна з бацькоўскай хаты. Доўга хадзіла па тых дарагіх сэрцу мясцінах, дзе гулялі яны з Янкам. Хадзіла ў апошні раз. А потым кінулася з крутога берагу ў глыбокі, чорны вір ракі, якая ў той вечар была вельмі неспакойнай, быццам адчувала бяду...

Гавораць, з тае пары пасля захаду сонца, калі туман пакрывае лугі, паяўляецца каля ракі хлопец. Шукае, кліча ён дзяўчыну. Чулі, як над ціхай гладдзю вады, над берагамі неслася: «В-і-л-я!..»

Так і клічуць цяпер людзі раку ў гонар каханай Янкі — Вілія.

## ГАНАРЫМСЯ ПЕРАМОГАЙ

КАМАНДУ універсітэта на V раённым злёце ўдзельнікаў Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа складалі сёлета слухачы падрыхтоўчага аддзялення і студэнты механіка-матэматычнага факультэта. Капітанам аднадушна быў выбраны Аляксандр Шленскі.

Прадстаўнікі БДУ занялі першае месца ў спаборніцтвах па комплексу ГПА (у асабістым заліку вызначыліся У. Гуль, М. Радзевіч, З. Пахадня), другое месца—у ваенізаванай эстафеце, трэцяе месца—у пераадоленні турысцкай паласы перашкод, самым цяжкім і цікавым спаборніцтве, другое месца—у конкурсе на лепшую ваенна-патрыятычную песню. Самай карэктнай была названа наша жаночая каманда ў спаборніцтвах па міні-футболу.

На выдатным узроўні быў арганізаваны наш лагер. Пастараліся і повары — каманда атрымала другое месца ў конкурсе на лепшы абед.

За кароткі час на злёце мы мацней пасябравалі, пачулі шмат новых песень, яшчэ раз пераканаліся ў незвычайнай прыгажосці роднай Беларусі.

Перамога дасталася нялёгка, усе стаміліся, але сілы прыбавілася ўтрая, калі стала зразумела — універсітэт першы. Кубак злёту ў другі раз уручаны універсітэту.

**А. НЕЖАВЕЦ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола,**
**А. ГУЛЕВІЧ,**
**загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола універсітэта.**

**ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ**

## КАРПАТЫ-82

ШМАТЛІКАЯ армія турыстаў выходзіць у гэтыя дні на маршруты нашай краіны. Адны аддаюць перавагу пешым паходам, другія пакараюць горныя вяршыні, трэція адпраўляюцца ў падарожжы па водных прасторах.

Захапленне водным турызмам ва ўсіх членаў нашай групы прыйшло ў розны час. Мы здзейснілі ўжо нямала падарожжаў, пабывалі на многіх рэках Беларусі. І вось нядаўна мы змаглі любавацца харaством украінскіх Карпат, бурлівай горнай ракой Стрый.

Рака быццам спецыяльна «абсталявана» ўсялякага роду перашкодамі: парогамі, шэверамі, валамі, мелямі. Як у песні пяецца: «...а за поворотом новый поворот...»

Так і нас чакалі наперадзе невядомыя павароты, да якіх трэба было падыходзіць падрыхтаванымі.

...Шум вады, выступаючыя каменні, парог. Брызгі вады заліваюць байдарку. Яшчэ імгненне, і прырода святкавала б перамогу, але трывалы разлік, высокая тэхніка, згуртаванасць членаў экіпажа — перамаглі. Непаўторнае пачуццё гонару ахоплівае турыста, калі ён пакідае за сабой парог, што здаваўся раней неадольным.

Зразумела, водны паход— гэта не толькі павышэнне спартыўнага майстэрства, але і духоўнае ўзбагачэнне ад сустрэчы з прыродай незнаёмага краю. Ганарлівая велічнасць гор, маляўнічы дыван кветак, стройныя блакітныя елкі не пакідалі нас абыякавымі. Увечары мы збіраліся ля кастра, дзяліліся ўражаннямі аб убачаным за дзень, заслухоўваліся песнямі ў выкананні Мішы Сярмяжкі, Дзімы Хайкіна, Гены Малагі, жартавалі, смяяліся.

Характэрнай асаблівасцю горных рэк з'яўляецца тое, што ўздоўж іх бесперапыннай паласой цягнуцца сялібы. Турысты ў Карпатах — з'ява прывычная для мясцовых жыхароў. І ўсё ж мы ледзь паспявалі адказваць на пытанні. З вялікай увагай слухалі жыхары расказ аб БДУ імя У. І. Леніна, аб нашым горадзе, аб прыродзе нашага краю. У вёсках і дамах адпачынку мы прачыталі дзесяць такіх лекцый і двойчы выступілі з канцэртнай праграмай.

Паход закончаны, але няма канца нашым падарожжам. Наперадзе — Карэлія.

**Т. АСКІРКА,**
**супрацоўнік універсітэта.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

10 чэрвеня 1982 г.

АТ 15318 Заказ 1140.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ